**Таіса ГУРКО-СУПРАНОВІЧ,**
**вядучы бібліёграф аддзела рэдкіх кніг Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, пісьменніца**

# Лёс Максіма

**Не так даўно ішла я на працу ва ўніверсітэт культуры і заўважыла, як маладая жанчына стаяла каля "Беларускай хаткі" і нешта занатоўвала. Яна звярнулася да мяне, удакладняючы, ці гэта сапраўды тая хата, дзе ў 20-я гады спыняўся Максім Багдановіч.**

Жанчына была карэспандэнтам з Расіі. Я ахвотна падзялілася з ёй сваімі ведамі пра беларускага класіка, пра яго самотнае жыццё, яго геніяльную паэзію і наогул феномен яго творчасці.

Прыехаў Максім Багдановіч у Мінск у 1916 годзе ўжо цяжка хворым. Тут ён апынуўся сярод творчых і культурных дзеячаў Беларусі: Ядвігіна Ш., Галубка, Зоські Верас ды іншых. Спачатку Максім працаваў у губернскім харчовым камітэце, затым — у Таварыстве дапамогі ахвярам вайны. Бачачы нямогласць Максіма, таварышы сабралі ў такі галодны і бедны час нейкія грошы і амаль сілком адправілі яго лячыцца ў Ялту. Потым ён напіша:

*У краіне светлай, дзе я ўміраю,*
*У белым доме ля сіняй бухты,*
*Я не самотны, я кнігу маю*
*З друкарні пана Марціна Кухты.*

Але больш самотны і незайздросны лёс, напэўна, выпадаў мала каму з беларускіх паэтаў.

На далёкай Волзе Максім не будзе знаходзіць паразумення ні ў кога. Нават родны бацька не падтрымае і не ацэніць пры жыцці талент сына. Мала таго, Адам Ягоравіч наогул лічыў, што такога народа — беларусаў — быццам і няма, а пра родную культуру, мову і літаратуру і слухаць не хацеў.

Максіма цягнула да Беларусі. Як ён настолькі палюбіў родную мову, пранікся беларускім духам у далёкай Расіі, аднаму Богу вядома. Магчыма, ад цёткі Марыі Ягораўны, роднай бацькавай сястры. Яна зусім маладой вельмі прыгожай дзяўчынай прыехала да аўдавелага брата гадаваць асірацелых дзяцей. Родам з Халопеніч, яна і размаўляла па-беларуску, і ладзіла ў сям'і ўсе беларускія святы, прытрымліваючыся традыцый, якія спрадвеку панавалі на Беларусі. Пасля цётка выйшла замуж, а Адам Багдановіч ажаніўся са сваячкай Максіма Горкага Аляксандрай Волжынай. Адаму было 37 год, Аляксандры толькі 17. Маладая мачаха добра ставілася да дзяцей, але пры родах памерла; немаўля забралі ў сваю сям'ю Пешкавы.

Першыя вершы Максім пасылае ў газету "Наша Ніва". Вершы ўхвалены і друкуюцца. Аднак няшчасці не пакідалі сям'ю. Хварэў бацька, хварэлі дзеці. Бацька, праўда, вазіў іх на кумыс, але здароўя гэта дадавала мала. Памёр старэйшы сын Вадзім, увесь час нездаровілася Максіму. Для дапамогі ў сям'ю прыехала цяпер ужо родная матчына сястра – Аляксандра Мякота. З ёю ў Максіма не склаліся адносіны. Зусім цяжка стала, калі адзін за адным пачалі нараджацца ў цёткі з бацькам дзеці. Максім зачыняўся ў сваім невялікім пакойчыку і пісаў. Бацька, як і раней, не ўнікаў у творчасць сына, лічыў, што быць літаратарам, асабліва беларускім, у лепшым выпадку несур'ёзна. Ён літаральна змусіў сына вывучыцца на юрыста (потым Максім ні дня не працаваў па гэтай спецыяльнасці).

Максіма па рэкамендацыі "Нашай Нівы" запрашалі ў Санкт-Пецярбург супрацоўнічаць з Акадэміяй навук па вывучэнні славянскіх літаратур. Але бацька быў супраць і фактычна не пусціў сына. Не будзем асуджаць за гэта Адама Ягоравіча, як ніколі не асуджаў яго і сын. Максім, ужо дарослы, разумеў, што бацьку біла жыццё з усіх бакоў: пахаваў дзвюх маладых жонак, паміралі малыя і дарослыя дзеці... Бацька адзін працаваў на ўсю вялікую сям'ю і проста вымушаны быў прымаць грашовую дапамогу ад Максіма Горкага.

Сын Максім лічыў бацьку няшчасным чалавекам і шкадаваў яго. Нават паміраючы ў Ялце, не хацеў турбаваць яго, хоць бацька знаходзіўся зусім блізка, у Сімферопалі. Так што жорсткі максімалізм Уладзіміра Караткевіча ў дачыненні да Адама Ягоравіча не да месца. Канечне, пазней, калі Максіма не стала, бацька ўсвядоміў, кім для Беларусі і наогул для свету быў яго сын. Але гэта ўсё потым, потым...

Вось пра што я расказала журналістцы з Расіі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ